**Марцынкевіч І.А.**

# ПРАБЛЕМА САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ІНВАЛІДАЎ І ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ

У рэчышчы даследаванняў сацыяльнай гісторыі пасляваенны перыяд выклікае несумнеўны навуковы і практычны інтарэс, паколькі з'яўляецца каштоўным вопытам савецкай дзяржавы па арганізацыі сістэмы сацыяльнага забеспячэння насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады. Важнасць і надзённасць вывучэння праблемы абумовілі цікавасць да тэмы яшчэ ў савецкі час. Працы гэтага перыяду гістарыяграфіі ўмоўна можна падзяліць на шэраг тэматычных блокаў, якія маюць дачыненне да вывучаемай тэмы. Па-першае, гэта комплекс прац, дзе вывучаюцца пытанні пасляваеннага адраджэння СССР і БССР, у якіх, тым не менш закраналіся асобныя аспекты станаўлення сістэмы сацыяльнага забеспячэння праз прызму пераходу да мірнага жыцця.

Пасляваеннае адраджэнне гаспадаркі СССР і БССР ва ўмовах пераходу да мірнага жыцця ў сваіх навуковых аналізах закраналі А.А. Андрэеў [1], Н.М. Бальшакоў [2], С.Г. Белікаў [3], Л.М. Валадарскі [4], І.І. Кузьміноў [5], Ю.І. Ласоўскі [6], С.Н. Малінін [7], І.Я. Марчанка [8, 9, 10]. Каштоўнасць такіх прац заключаецца ў магчымасці падрабязна разгледзець тыя эканамічныя і палітычныя рэаліі, на аснове якіх адбывалася станаўленне сістэмы сацыяльнага забеспячэння з улікам наступстваў Вялікай Айчыннай вайны. Асобным пунктам трэба вылучыць працы А.П. Купрэевай [11]. Вывучаючы пытанні аднаўлення гаспадаркі БССР, аўтар надавала вялікую ўвагу асвятленню тэмы матэрыяльнага забеспячэння насельніцтва пасля выгнання акупантаў за межы рэспублікі.

У другой палове 1950-х – 1960-я гг. увага савецкіх гісторыкаў была звернута да пенсійнага забеспячэння, што было звязана з прыняццем 14 ліпеня 1956 года Вярхоўным Саветам СССР закона "Аб дзяржаўных пенсіях". У публікацыях Г.С. Кудраўцава [14], Б.П. Гарахоўскага [15], Р.Н. Карташова [16], С.Н. Власава [17] акцэнтавалася ўвага на станоўчых баках прынятага закона, а таксама разглядаліся пытанні сацыяльных пенсій па інваліднасці і аказання іншай матэрыяльный дапамогі былым франтавікам.

З сярэдзіны 1970-х – пачатку 1980-х гг. з'явіліся новыя агульныя даследаванні па развіцці пасляваеннага горада і вёскі, якія ўжо ў большай ступені закранaлі праблематыку сацыяльнага забеспячэння былых франтавікоў, а іменна забеспячэнне жылплошчай, працаўладкаванне і працоўнае навучанне дэмабілізаваных. Да гэтых пытанняў звярталіся А. Е. Казлоўская, А. П. Купрэева [17]. Развіццё беларускай вёскі ў пасляваенныя гады, станаўленне калгаснай сістэмы ў сваіх працах вывучала А. П. Белязо [12], якая адлюстравала цяжкія наступствы нямецка-фашысцкай акупацыі ў сельскай гаспадарцы, меры партыі і ўрада па развіцці вёскі, ролю калгасаў у вырашэнні сацыяльных праблем былых франтавікоў-калгаснікаў [12, 19]. Аўтары З. І. Гіяргадзе, Л. Ф. Герашчанка [19], А.Я. Казлоўская [17] у сваіх даследаваннях засяроджвалі ўвагу на жыллёвых праблемах ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

З канца 1980-х гадоў у навуковы ўжытак уводзяцца недаступныя раней крыніцы, выпрацоўваюцца новыя метадалагічныя падыходы ў асвятленні традыцыйных для савецкай гістарыяграфіі праблем. Спробы зрабіць комплекснае і сістэмнае даследаванне з выкарыстаннем новых архіўных матэрыялаў і дакументаў здзейснілі расійскія гісторыкі. Так, ажыццяўленне сацыяльнай палітыкі ў адносінах да інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў першыя пасляваенныя гады было ахарактарызавана ў працах Л.П. Думало [21], Л.М. Зейналава [22], В.С Кажурына, Г.Г Загвоздкіна [23] З'яўляецца даследаванне А.Ю. Зубковай "Общество и реформы, 1945–1964 гг." [24], у якім аўтар разглядае перабудову ў сацыяльнай сферы і яе ўплыў на настрой у савецкім грамадстве [25]. Развіваецца рэгіянальнае вывучэнне сацыяльнай гісторыі пасляваеннага перыяду (публікацыі Л.М. Кажэўнікава [26], А.С. Каняхіна [27], М.Н. Мануйлава [28], Т.П. Стральцовай [29].

Адным са значных даследаванняў, дзе паслядоўна і сістэматызавана выкладзены падзеі беларускай гісторыі пасля вайны, стала другая частка "Нарысаў гісторыі Беларусі" пад рэдакцыяй акадэміка М.П. Касцюка. У кнізе адлюстроўваліся як дасягненні ў сацыяльным забеспячэнні, так і цяжкасці і супярэчнасці, з якімі сутыкнулася беларускае грамадства ў гэтым плане [30]. З'явілася абагульняючая праца "Пасляваеннае аднаўленне і развіццё Беларусі (1945–1992 гг.)" [31].



Репозиторий БГУ

У 2000-х гадах у айчыннай гістарыяграфіі актывізуецца цікавасць да вывучэння сацыяльнай гісторыі БССР. Сярод нешматлікіх публікацый, прысвечаных непасрэдна тэме забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, асаблівай увагі заслугоўваюць даследаванні А.Л. Стрэльчанкі [32, 33]. Абапіраючыся на багаты архіўны матэрыял, яна разглядае праблемы сацыяльнай адаптацыі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны да мірнага жыцця ў перыяд 1943–1956 гг. на тэрыторыі БССР. Аўтар характарызуе прававы статус інвалідаў вайны, аналізуе ўмовы іх адаптацыі, разглядае дзейнасць дзяржаўных органаў у межах сацыяльнага забеспячэння і структурныя змены ў арганізацыі сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў, партызан і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны.

Некаторыя аспекты савецкай сацыяльнай палітыкі пасля вайны разглядаюцца ў манаграфіі А.Ю. Зубковай "Послевоенное советское общество: политика и повседневность, 1945–1953 гг." [34]. Спасылаючыся на вялікі комплекс архіўных крыніц, аўтар паказвае пасляваеннае савецкае грамадства ў сітуацыі пераходу ад вайны да міру. Значнае месца даследчыца адводзіць такой катэгорыі грамадзян, як інваліды Вялікай Айчыннай вайны і дэмабілізаваныя. Яна звяртае ўвагу не толькі на іх матэрыяльныя патрэбы, але і на псіхалагічную адаптацыю ў пасляваенным грамадстве. Блізкай па тэматыцы ў гэтым плане з'яўляецца работа Ю.М. Мануйлавай "Социальная реабилитация инвалидов войны в РСФСР в 1941–1945 гг.", у якой аўтар асвятляе праблемы вяртання да мірнага жыцця ўдзельнікаў вайны [35]. Праблемай сацыяльнага забеспячэння інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны ў УССР (1941–1950 гг.) займалася ўкраінскі гісторык Г.М. Гардзіенка [36]. У сваім навуковым даследаванні яна прывяла колькасць інвалідаў вайны ў УССР, раскрыла змест асноўных падыходаў савецкай дзяржавы да гэтай катэгорыі грамадзян, выявіла эфектыўнасць медыцынскай рэабілітацыі і матэрыяльна-бытавога абслугоўвання.

Вастрыню праблемы вяртання інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны да мірнага жыцця ў СССР разглядае нямецкая даследчыца Б. Фізелер [37]. Яна звяртае ўвагу на прававыя аспекты ў дачыненні да сацыяльнага забеспячэння, прафесійнай рэінтэграцыі, дзяржаўных пенсій, матэрыяльнай дапамогі і формы пратэсту. Аднак трэба адзначыць, што ў сваёй публікацыі яна імкнецца акцэнтаваць увагу на негатыўных праявах тагачаснай сацыялнай рэальнасці.

Такім чынам, сацыяльнае забеспячэнне інвалідаў у БССР ў 1943–1956 гг. не было прадметам самастойнага даследавання ў савецкай беларускай гістарыяграфіі і асобныя аспекты тэмы закраналіся ў агульных навуковых працах па праблемах сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у пасляваенны перыяд. У апошнія гады назіралася цікавасць даследчыкаў да праблем сацыяльнай гісторыі: з'явіліся публікацыі, прысвечаныя пытанням сацыяльнага забеспячэння інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, былі агучаны лічбы па колькасці інвалідаў вайны ў БССР, адзначаны пэўныя цяжкасці ў медыцынскім абслугоўванні і вырашэнні жыллёвых праблем.


1. Андрэеў, А. А. Аб мерах уздыму сельскай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд / А. А. Андрэеў. – Мінск : Дзяржвыд БССР, 1947. – 92 с.
2. Большаков, Н. М. Борьба Коммунистической партии и Советского правительства за подъём материального благосостояния и культурного уровня советского народа в послевоенный период : автореф. дисс… канд. ист. наук: 07.00.01 / Н.М. Большаков. – Минск, 1956. – 19 с.
3. Беликов, С. Г. Послевоенное развитие сельского хозяйства СССР / С. Г. Беликов. – М. : Московский рабочий, 1951. – 64 с.
4. Володарский, Л. М. Послевоенная пятилетка в действии / Л. М. Володарский. – М. : Госполитиздат, 1947 – 46 с.
5. Кузьміноў, І. І. Сканчэнне вайны і пераход гаспадаркі СССР да мірнага развіцця / І. І. Кузьміноў. – Мінск : Дзярж. Выд-ва БССР, 1946. – 23 с.
6. Ласовский, Ю. И. Улучшение жилищно-коммунальных условий трудящихся в БССР за годы Советской власти / Ю. И. Ласовский // Учёные записки БГИНХ. – 1959. – № 3.
7. Малинин, С. Н. Развитие социалистической промышленности Белорусской ССР / С. Н. Малинин. – 2-е изд., доп. – Минск : Госиздат БССР, 1950. – 30 с.
8. Марчанка, М. В. Беларусь ва ўмовах пераходу ад вайны да мірнага развіцця (1945−1946) / М. В. Марчанка // Весці АН БССР серыя грамадскіх навук. – 1997. – № 1. – С. 33−44.
9. Марченко, И. Е. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950) / И. Е. Марченко. – Минск : Из-во Академия наук БССР, 1962. – 259 с.
10. Марченко, И. Е. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР (1943−1950 гг.) / И. Е. Марченко. – Минск : Наука и техника БССР, 1977 г. – 248 с.
11. Купреева, А. П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии / А. П. Купреева ; науч. ред. П. Т. Петриков. – Минск : Наука и техника, 1976. – 224 с.




Репозиторий ВГУ

12. Белязо, Е. П. Современное белорусское село / Е. П. Белязо. – Минск : Наука и техника, 1976. − 112 с.
13. Власов, С. Н. Социальное обеспечение колхозников /С. Н. Власов. – М. : Сельхозгиз, 1960. – 72 с.
14. Гороховский, Б. П. Пенсии по инвалидности по закону о государственых пенсиях / Б. П. Гороховский. – М. : Госюриздат, 1957. – 54 с.
15. Карташов, Р. Н. Развитие сельского хозяйства СССР после сентябрьского пленума ЦК КПСС (1953 г.) / Р. Н. Карташов // Вопросы истории. – 1957. – № 11(1) – С. 48−64.
16. Кудрявцев, Г. С. О государственных песнсиях / Г. С. Кудрявцев. – Л. : Лениздат, 1958. – 134 с.
17. Козловская, А. Е. Рост материального благосостояния рабочего класса БССР, 1946–1970 / А. Е. Козловская ; под ред. В. А. Полуяна. – Минск : Наука и техника, 1987. – 195 с.
18. Белязо, Е. П. Крестьянство на пути к развитому социализму / Е. П. Белязо. – Минск : Наука и техника, 1982. – 206 с.
19. Гіяргадзе, З. І. Аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі (1944−1950 гг.) / З. І. Гіяргадзе [і інш.] // Весці АН БССР серыя грамадскіх навук. – 1985. – № 2. – С. 10−17.
20. Волков, И. М. Колхозы СССР в годы четвертой пятилетки (1946–1950) // Развитие сельского хозяйства в послевоенные годы (1946–1970 гг.). – М., 1972. – С. 41–71
21. Думало, Л. П. Социальная политика Советского государства и изменение социально-классовой структуры сельского населения в 50-60-е годы / МГУ им. М.В. Ломоносова, Исторический. факультет. – М., 1989. – 23 с.
22. Зейналова, Л. М. Социальная политика по отношению к крестьянству (середина 40-х−середина 60-х гг на материалах РСФСР) / Л. М. Зейналова ; Саратов. гос. ун-т им. Н. Г. Чернышевского. – Саратов, 1995. – 17 с.
23. Загвоздкин, Г. Г. Социальная политика ВКП(б) и Советского государства в годы Великой Отечественной войны / Г. Г. Загвоздкин ; ЛГУ. – Л., 1991. – 43 с.
24. Зубкова, Е. Ю. Общество и реформы, 1945–1964 / Е. Ю. Зубкова – М. : Россия молодая, 1993. − 198 с.
25. Кожурин, В. С. Социальная политика советского государства по отношению к рабочему классу в годы Великой Отечественной войны / В. С. Кожурин ; Акад. общ. наук при ЦК КПСС. – М., 1991. – 52 с.
26. Кожевникова, Л. М. Социальная политика в деревне в первое послевоенное пятилетие / Л. М. Кожевникова ; Красноярский гос. ун-т. – Красноярск, 1990. – 24 с.
27. Коняхин, А. С. Восстановление народного хозяйства в европейской части России в 1945−1953 гг.: социальные аспекты / А. С. Коняхин. – Армавир : АГПА, 2010. – 157 с.
28. Мануйлова, М. Н. Аграрный сектор в период послевоенного восстановления и реконструкции управленческой системы (1945–1964) / М. Н. Мануйлова. – Пятигорск, 2004. – 25 с
29. Стрельцова, Т. П. Амурская деревня: противоречия и трудности послевоенного развития (1946–1965 гг.) / Т. П. Стрельцова. – Владивосток, 2006 – 28 с.
30. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. Ч. 2. / М. П. Касцюк [і інш.] ; Інстытут гісторыі АНБ. – Мн. : Беларусь, 1995. – 560 с.
31. Пасляваеннае аднаўленне і развіццё Беларусі (1945−1992 гг.) / БДПУ. – Мінск, 1994. – 46 с.
32. Стрельченко, Е. Л. Система социального обеспечения в БССР (1943–1946 гг.) / Е. Л. Стрельченко // Веснік БДУ. Сер. 3. – 2011. – № 1 – С. 16–20.
33. Стрельченко, Е. Л. Социальная адаптация инвалидов Великой Отечественной войны в БССР (1943−1956 гг.) / Е. Л. Стрельченко // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 7 / рэдкал.: У. К.Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2012. – 239 с. – С. 108−121.
34. Зубкова, Е. Ю. Послевоенное советское общество: политика и повседневность. 1945–1953 / Е. Ю. Зубкова. – М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 1999. – 229 с.
35. Мануйлова, Ю. Н. Социальная реабилитация инвалидов войны в РСФСР в 1941−1945 годах / Ю. Н. Мануйлова. – Челябинск : ЧГУ, 2003. – 136 с.
36. Гордієнко, Г. М. Соціальне забеспечення інвалідів Вітчізняної війни в УРСР (1941−1950 рр.) / Гордієнко Галина Миколаївна. – 2010. – 16 с.
37. Физелер, Б. «Нищие победители»: инвалиды Великой Отечественной войны в Советском Союзе / Б. Физелер // Неприкосновенный запас 40/41(2–3), 2005. – С. 290–297.